Еще один прием работы на данном этапе – это словарная работа с опережением. Если в тексте встречаются устаревшие слова, диалектизмы или сложные термины, их стоит разобрать до чтения, но не в формате диктовки определений, а через догадку. Задание: «В тексте встретится слово «терем». Как вы думаете, что это такое? Похоже ли оно на дом? А слово «лапоть» – это обувь или одежда?». Цель: снять барьер непонимания, который может возникнуть в процессе чтения и нарушить целостность восприятия сюжета.

Второй этап – работа с текстом во время чтения. Это самый важный этап, на котором происходит непосредственное взаимодействие с текстом. Задача учителя – научить ребенка «мониторить» свое понимание: «Понял ли я этот абзац? Нужно ли перечитать?». Эффективными являются приемы «Чтение с остановками», «Инсерт (Пометки на полях)», «Поиск ключевых слов», «Вопросы автору».

Третий этап – работа с текстом после чтения. На этом этапе происходит закрепление информации, ее анализ, интерпретация и творческое переосмысление. Ребенок должен не просто вспомнить текст, а пропустить его через призму собственного опыта. Практические приемы: «Линия сравнения», «Синквейн», «Пересказ от другого лица», «Незаконченное предложение». Можно использовать творческие задания (рисование, инсценировка).

Значительное место при работе на всех этапах является визуализация учебного материала. «Визуализация поможет ученику не только овладеть необходимой базой знаний, но и научит выделять важное и главное в огромных потоках информации, а также анализировать ее, что научит ученика критически мыслить, так как это крайне необходимо и важно уметь современному школьнику» [1, с. 130].

Развитие осознанного чтения – это не единичный урок, а длительный и целенаправленный процесс. Ключевая задача педагога – создать на занятии безопасную среду, где непонимание текста или ошибочная интерпретация не осуждаются, а становятся отправной точкой для совместного поиска смысла. Нельзя торопить детей с ответом. Молчание, пауза для осмысления – это не пустое время, а важнейший этап работы с текстом.

**Заключение.** Формирование навыка осознанного чтения у обучающихся на первой ступени общего среднего образования представляет собой комплексную педагогическую задачу. Ее успешное решение зависит от системных усилий квалифицированного учителя. Методически выверенная организация работы с текстом является ключевым механизмом для трансформации роли ученика: из объекта, получающего информацию, он становится субъектом, активно ее добывающим, анализирующим и оценивающим.


1 Крицкая, Н. В. Визуализация как средство активизации познавательной деятельности обучающихся на первой ступети общего среднего образования / Н. В. Крицкая, И. Н. Гладкая // Актуальные вопросы педагогического образования : монография. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2024. – С. 130-148. URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/42737/1/130-148.pdf (дата обращения: 08.03.2026) – Текст: электронный.


## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ


***Жыгун Л.Д.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Васюковіч Л.С., доктар пед. навук, прафесар


Адной з найважнейшых задач сучаснай пачатковай адукацыі з'яўляецца фарміраванне і развіццё моўнай асобы навучэнца, які валодае багатым слоўнікавым запасам, умее дакладна і выразна выказваць уласныя думкі. Беларуская мова як вучэбны прадмет мае ў гэтым плане ўнікальныя магчымасці. Асаблівае месца ў сістэме працы па развіцці маўлення займае выкарыстанне фальклорных твораў. Малыя фальклорныя жанры – прыказкі, прымаўкі, загадкі, скорагаворкі, казкі – увабралі мудрасць народа, яго назіранні за жыццём і прыродай. Яны ўзбагачаюць духоўны свет дзіцяці, фарміруюць любоў да роднага слова, садзейнічаюць развіццю вобразнага мыслення

і выразнасці маўлення. *Мэта артыкула* – вызначыць ролю і метадычны патэнцыял выкарыстання фальклорных твораў у сістэме развіцця маўлення малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі працы па методыцы развіцця маўлення (Н.М. Антановіч, М.Р. Львоў, Т.А. Ладыжанская, М.С. Раждзественскі, М.Г. Яленскі), зборнікі народных казак, прыказак, загадак, а таксама вучэбныя дапаможнікі для пачатковай школы. У працы выкарыстаны метады тэарэтычнага аналізу літаратуры, метад абагульнення педагагічнага вопыту.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Праблема развіцця маўлення навучэнцаў з'яўляецца адной з цэнтральных у лінгваметодыцы. Пад развіццём маўлення разумеюць складаны працэс авалодання багаццем мовы, сродкамі выразнасці, уменнем будаваць звязныя выказванні ў розных маўленчых сітуацыях. На пачатковым этапе навучання, калі дзіця пачынае ўсведамляць сябе як моўную асобу, надзвычай важна стварыць умовы для назапашвання актыўнага слоўніка і развіцця пачуцця мовы.

Фальклор з'яўляецца невычэрпнай крыніцай для маўленчага развіцця. Як слушна заўважаюць даследчыкі [1; 2], фальклорныя творы адрозніваюцца вобразнасцю, рытмічнасцю, эмацыянальнасцю, што робіць іх даступнымі і прывабнымі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Менавіта праз фальклор дзіця далучаецца да культуры свайго народа, пазнае асаблівасці яго светапогляду і сістэму каштоўнасцей. Разгледзім асноўныя напрамкі працы з фальклорнымі творамі.

Прыказкі і прымаўкі з'яўляюцца удзячным матэрыялам для развіцця лагічнага мыслення і ўзбагачэння слоўніка. Яны вучаць бачыць сувязь паміж з'явамі, разумець пераносны змест слоў. У пачатковых класах мэтазгодна выкарыстоўваць прыказкі для выканання наступных відаў заданняў: тлумачэнне сэнсу прыказкі; вызначэнне тэмы прыказкі; падбор прыказак да пэўнай жыццёвай сітуацыі; дапісванне пачатку і канца прыказкі; уключэнне прыказкі ў тэкст (вуснае ці пісьмовае выказванне); знаходжанне ў прыказках слоў з пэўнай арфаграмай і інш.

Напрыклад, вывучаючы тэму «Сям'я», можна прапанаваць вучням растлумачыць прыказкі *«Уся сям'я разам – душа на месцы»*, *«Дзяцей гадаваць – не куранят збіраць»*. Пры вывучэнні тэмы «Праца» дарэчнае выкарыстанне выслоўяў *«Праца чалавека корміць, а лянота псуе»*, *«Хто не працуе, той не есць»*.

Загадкі спрыяюць развіццю вобразнага мыслення, назіральнасці, уменню вылучаць істотныя прыметы прадмета. Яны ўзбагачаюць маўленне дзяцей за кошт слоў, якія абазначаюць якасці, уласцівасці, дзеянні. Праца з загадкамі можа ўключаць: адгадванне загадкі і тлумачэнне, па якіх прыкметах знайшлі адгадку; прыдумванне сваіх загадак па аналогіі; аналіз моўных сродкаў (параўнанні, метафары, эпітэты); спісванне загадак з заданнем знайсці і падкрэсліць вывучаныя арфаграмы.

Скорагаворкі з'яўляюцца эфектыўным сродкам для развіцця артыкуляцыйных навыкаў і выпрацоўкі добрай дыкцыі. Выразнае, хуткае і правільнае прагаворванне скорагаворак дапамагае пераадольваць маўленчыя цяжкасці, рабіць маўленне больш выразным. На ўроках беларускай мовы можна ладзіць конкурсы на лепшае вымаўленне скорагаворак, спалучаць гэта з аналізам цяжкіх для вымаўлення гукаў і іх абазначэннем на пісьме.

Народныя казкі даюць багаты матэрыял для развіцця звязнага маўлення. Пасля прачытання казкі мэтазгодна праводзіць наступныя віды работ: падрабязны, выбарачны або сціслы пераказы; вуснае маляванне (апісанне герояў, месца дзеяння); складанне характарыстыкі персанажа з выкарыстаннем цытат з тэксту; прыдумванне іншага канца казкі; інсцэніроўка асобных эпізодаў і інш.

Вельмі важна, каб праца з фальклорнымі творамі праводзілася не эпізадычна, а сістэматычна, арганічна ўпісвалася ў структуру ўрока. Можна вылучыць некалькі этапаў такой работы:

1. *Падрыхтоўчы этап.* Чытанне і слуханне фальклорных твораў, першаснае знаёмства з іх зместам, лексічная праца (тлумачэнне значэння незразумелых слоў).

2. *Аналітычны этап*. Аналіз моўных асаблівасцей твора: знаходжанне вобразных выразаў, параўнанняў, устойлівых зваротаў, назіранне за рыфмай і рытмам.

3. *Прадуктыўны этап*. Стварэнне ўласных выказванняў на аснове фальклорнага матэрыялу: падрабязны пераказ, творчы пераказ, складанне загадак, невялікіх апавяданняў па матывах прыказак, інсцэніроўка твораў.

4. *Кантрольны этап.* Ацэнка маўленчых уменняў навучэнцаў, выяўленне тыповых памылак і планаванне далейшай працы.

Выкарыстанне фальклору цесна звязана з фарміраваннем не толькі маўленчых, але і арфаграфічных навыкаў. На аснове тэкстаў прыказак, загадак, казак можна праводзіць розныя віды дыктовак (папераджальныя, тлумачальныя, творчыя), спісванне з заданнямі. Гэта дазваляе эканомна выкарыстоўваць вучэбны час і дасягаць некалькіх мэт: удасканаленне правапісных навыкаў і развіццё маўлення.

**Заключэнне.** Такім чынам, фальклор з'яўляецца эфектыўным сродкам развіцця маўлення малодшых школьнікаў. Ён выконвае некалькі важных функцый: адукацыйную (пашырае веды пра навакольны свет, гісторыю і культуру народа); развіццёвую (развівае мысленне, памяць, увагу, узбагачае слоўнік, фарміруе маўленчыя ўменні); выхаваўчую (фарміруе павагу да народных традыцый, маральныя якасці).

Развіццё маўлення малодшых школьнікаў з'яўляецца адной з прыярытэтных задач пачатковай адукацыі. Фальклорныя творы з іх вобразнасцю, мілагучнасцю, глыбокім зместам ствараюць спрыяльныя ўмовы для ўзбагачэння слоўніка, развіцця граматычнага ладу маўлення, фарміравання ўмення будаваць звязныя выказванні. Сістэматычная і мэтанакіраваная праца з прыказкамі, загадкамі, казкамі не толькі павышае моўную кампетэнцыю вучняў, але і фарміруе іх духоўна-маральны свет, выхоўвае павагу да культуры свайго народа. Гэта стварае трывалы падмурак для станаўлення асобы, здольнай свабодна і выразна карыстацца роднай мовай ва ўсіх сферах жыцця.

1. Актуальныя праблемы развіцця сучаснай методыкі выкладання беларускай мовы / пад навук. рэд. В.П. Протчанкі, М. Г. Яленскага. – Мінск: НІА, 2011. – 212 с.
2. Беларускі дзіцячы фальклор / уклад. Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 336 с.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИГРОВЫХ ОБУЧАЮЩИХ СИТУАЦИЙ В ВОСПИТАНИИ БЕРЕЖНОГО ОТНОШЕНИЯ К ПРИРОДНЫМ РЕСУРСАМ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

***Казакевич Д.М., Корешкова Д.С.,***
*студентки 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Бумаженко А.И., ст. преподаватель

Дошкольный возраст – важный этап в развитии экологической культуры человека. В этот период закладываются основы личности, в том числе позитивное отношение к природе, окружающему миру. Ребенок начинает выделять себя из окружающей среды, развивается эмоционально-ценностное отношение к окружающему, формируются основы нравственно-экологических позиций личности, которые проявляются во взаимодействиях ребенка с природой, в осознании неразрывности с ней [1].

Проблема воспитания бережного отношения к природе и природным ресурсам у детей дошкольного возраста рассматривалась Арсентьевой В.П., Васильевой А.И., Золотовой Е.И., Игнаткиной Л.С., Комаровой И.А., Кшнясевой Л.Л., Маневцевой Л.М., Марковой Т.А., Николаевой С.Н. и др.

Бережное отношение к природным ресурсам – это система осознанных действий и принципов природопользования, направленная на рациональное использование, восстановление и сохранение компонентов окружающей среды (вода, воздух, почва, полезные ископаемые и т.д.) для обеспечения экологической безопасности и удовлетворения потребностей человека.